# УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Т. І. ДОЎНАР, П. С. БЫЧКОЎСКІ
*Установа адукацыі*
*"Юрыдычны каледж Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта"*

Своеасаблівай кропкай адліку ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове стаў Першы Усебеларускі з'езд, скліканы ў снежні 1917 года пры фінансавай падтрымцы ўрада Савецкай Расіі. Выбранаму на даным з'ездзе органу ў адпаведнасці з заключаным пагадненнем павінна была перайсці ўся паўната ўлады на тэрыторыі Беларусі. Але ў выніку гвалтоўнага разгону Першага Усебеларускага з'езда кіраўніцтвам Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і Фронту (Аблвыканкамзаха) легітымны працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці быў перапынены. Аднак дадзенае пытанне не было знята з павесткі дня. Дзеячы левага крыла беларускага нацыянальнага руху ўвайшлі ў склад створанага Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама), які функцыянаваў на правах аддзела Народнага камісарыята па справам нацыянальнасцей РСФСР. Новы орган, Белнацкам, заклаў асновы будучай беларускай савецкай дзяржаўнасці. Белнацкам праводзіў палітычную і культурна-асветніцкую работу сярод беларусаў. Яго прадстаўнікі апякалі бежанцаў, адкрывалі беларускія школы, клубы, выдавалі літаратуру на беларускай і рускай мовах. Пагэтаму яны знаходзілі шырокую падтрымку сярод народа.

Летам 1918 г. Белнацкам выступіў з прапановай аб пераўтварэнні Заходняй вобласці ў аўтаномную рэспубліку ў складзе РСФСР. Беларускія секцыі РКП (б) яго падтрымалі. Кіраўніцтва Аблвыканкамзаха (А. Мяснікоў і В. Кнорын) адхілілі гэтую прапанову, і ў верасні 1918 г. Заходняя вобласць па іх ініцыятыве была перайменаваная ў Заходнюю камуну.

У канцы 1918 г. урад Савецкай Расіі прыйшоў да меркавання, што неабходна стварыць бар'ер (буфер) паміж буржуазнай Польшчай і Савецкай Расіяй у выглядзе Беларускай Савецкай Рэспублікі. Вызначальным крокам на шляху нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэнн6я Беларусі на савецкай аснове сталі рашэнні канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), якія адбыліся 21–23 снежня 1918 г. у Маскве. Было абрана Цэнтральнае бюро (ЦБ) беларускіх камуністычных арганізацый. Перад ім была пастаўлена задача – стварыць Беларускую камуністычную партыю і Беларускую Савецкую Рэспубліку.

27 снежня 1918 г. Сталін правёў нараду ў Маскве з Мясніковым і Калмановічем, на якой была акрэслена тэрыторыя Беларускай рэспублікі з пяці губерняў: Гродненскай, Мінскай, Магілеўскай, Віцебскай і Смаленскай, а таксама вызначаны склад урада (старшыня і 15 членаў) і паўнамоцтвы рэспублікі. Згодна з пунктам 6 дырэктыў Наркамнаца, правы і абавязкі ЦК партыі і аддзелаў урада павінны былі застацца такімі, "як і былога Абласнога Камітэта і атдзелаў Аблвыканкамзаха". Аб самастойнасці будучай ССБР тут размова не вялася. Фактычна меркавалася, што яна заснецца ў РСФСР на правах абласной аўтаноміі.

30 снежня 1918 г. у Смаленску VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б) абвясціла сябе 1 з'ездам КП (б)Б, які абвясціў БССР. Быў абраны кіруючы орган партыі – Цэнтральнае бюро. Яго ўзначаліў А. Мяснікоў. У той жа дзень была прынята пастанова аб тэрыторыі Беларусі. Згодна з ей асноўным ядром Беларускай рэспублікі лічыліся губерні Мінская, Смаленская, Магілеўская, Віцебская і Гродненская з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі. Зм. Жылуновічу і А. Чарвякову было даручана падрыхтаваць праект Маніфеста Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада. 31 снежня ЦБ КП (б)Б зацвердзіў склад Часовага ўрада на чале з Дз. Жылуновічам.

Вечарам 1 студзеня 1919 года быў канчаткова сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі пад старшынствам Дз. Жылуновіча. У гэты ж дзень па радыё быў аднародаваны Маніфест аб стварэнні ССРБ, а ў ноч з 1 на 2 студзеня яго выдалі ў друку. У тэксце Маніфеста Беларусь абвяшчалася свабоднай незалежнай сацыялістычнай рэспублікай, замацоўваліся асноўныя палажэнні яе грамадскага і палітычнага строю. 5 студзеня ўрад БССР і ЦБ КП(б)Б пераехалі у Мінск, які стаў сталіцай БССР. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП (б) прыняў рашэнне аб уключэнні Смаленскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў у склад РСФСР, а з Мінскай, Гродзенскай, Ковенскай і Віленскай губерняў стварыць літоўска-беларускую савецкую рэспубліку.

На першым паседжанні 7 студзеня было прынята рашэнне аб скліканні 1 Усебеларускага з’езда Саветаў для юрыдычна-прававога факта афармлення рэспублікі, які адбыўся 2–3 лютага 1919 г. у Мінску. На ім Я. Свярдлоў зачытаў пастанову УЦВК РСФСР аб прызнанні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. З’езд выбраў ЦВК, прыняў першую Канстытуцыю БССР, дэкларацыю аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР, зацвердзіў прапанову ЦК РКП (б) аб аб'яднанні Літоўскай ССР і БССР (Літбел створана 27 лютага 1919 г. як буферная дзяржава).

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ССРБ праз два месяцы пасля абвяшчэння была фактычна ліквідавана, яе ўтварэнне сведчыла аб тым, што ў гісторыі беларускага народа пачаўся новы перыяд. 31 ліпеня 1920 года пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад польскіх захопнікаў, адбылося другое абвяшчэнне БССР.

Пры напісанні творчай работы выкарыстоўваліся працы такіх вучоных, як П. Брыгадзін, А. Багдановіч, А. Грыцкевіч, І. Ігнаценка, якія дапамаглі найбольш поўна асвятліць працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці.